# ФРАЗЕАЛОГІЯ

**Асноўныя паняцці:** фразеалагізм, прыфраземнае слова, фразеалагічныя зрашчэнні, адзінствы, злучэнні і выразы, фразеалагічныя сінонімы, антонімы і амонімы, мнагазначнасць фразеалагізмаў, варыянтнасць фразеалагізмаў, прыказкі, крылатыя выразы, перыфразы.

**1. Прачытайце сказы, знайдзіце фразеалагізмы, растлумачце іх значэнні і вызначце сінтаксічную ролю ў сказе.**

1. І дзядзька майстар быў на штукі, і быў механік на ўсе рукі (К-с). 2. Колькі мне тут жыць засталося, а яна ні на дзень спакою не дае, поедам есць. І што з ёю сталася – розуму не дабяру. Усё адно як з ланцуга сарвалася (З.П.). 3. Зірнула з усмешачкай, і Васілю здалося, што з яе язычка сарвецца штосьці кплівае, крыўднае (І.М.). 4. А ты маўчы, свяці вачамі перад паўпанкамі, панкамі і перад панскім розным збродам, цярпеннем скованы, як лёдам! (К-с). 5. Васька ўвайшоў у ролю і адчуваў сябе на кані (Жук). 6. Алесь быў нібы сам не свой (Каратк.). 7. Напрацаваўшыся як мае быць, рэжучы дровы, Васілю цяпер прыемна было адчуваць гарачую млявасць у руках, у плячах – ва ўсім целе (Стр.). 8. Непаладкі ў калгасе, хвароба жонкі і яе спроба атруціцца маглі выбіць з сядла любога чалавека, толькі не Васько (Асіп.). 9. Міхал затрос тут галавою: -- Ой, дасца гэта служба ў знакі! На карк уссядзе д'ябал усякі (К-с). 10. Добрую палавіну хаткі займала нізкая гліняная печ з камінам, дзе на скорую руку варылі бульбу, а вечарамі палілі лучыну (Як.). 11. Нічога, я дзе-небудзь на тапчанчыку або хоць на зямлі за мілую душу прасплю і падамся заўтра далей (К. Ч.). 12. Але я ведаў, што многія нашы хлопцы маюць на яе [Надзею] вока і што Грыша Ярашэвіч, з дзясятага, ходзіць за ёю па пятах (З. П.).

**2. Падбярыце да наступных фразеалагізмаў прыфраземныя словы і запішыце іх разам з фразеалагізмамі.**

Узор: У чорным целе – трымаць у чорным целе.

Вока ды вока, да апошняй кроплі крыві, душа ў душу, пад мухай, святым духам, на ўсе лапаткі, на ўсё горла, на горкі яблык, на шапачны разбор, пад гарачую руку, спусціўшы рукавы, як гром з яснага неба, як дзве кроплі вады, як з вядра, як карове сядло, як пшаніцу прадаўшы, як па масле, як сваіх вушэй, як смала, як снег на галаву.

**3. Вызначце тып фразеалагізмаў паводле ступені семантычнай злітнасці кампанентаў.**

1. Адно Алеся суцяшала – і Кастуся бяда спаткала: Кастусь на "веруі" сеў макам, -- абодвум кепска, небаракам (К-с). 2. "Базы няма. Напэўна, перабазіравалася ў іншае месца ...". – "Называецца, гарадзілі агарод. Плялі лапці", -- прабурчэў Лукашоў (В.Б.). 3. "Чыя ж праўда? – з выглядам пераможцы запытаў ён [Анцыпік] і дадаў: -- Лезці на ражон нікому не рэкамендуецца" (К-с). 4. – А ты, каханенькая, родненькая, не слухай вушы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

развесіўшы, ды лепей часцей глядзі (Куп.). 5. – О, о, глядзі, -- зноў пачуўся насмешлівы голас ззаду, -- глядзі, як дагаджаюць, лістам сцелюцца (З.П.).
6. Хай цябе не засмуціць твой першы агрэх, людзі добрыя нас не падымуць на смех (А.К.). 7. Ды як было ёй сядзець склаўшы рукі, бы пані якой, калі і ў сваёй хаце гэтулькі клопату (З.П.). 8. Даў, як заяц, лататы праз дарогу – у кусты (Ал.). 9. Крукам сядзела Марыля над Паўлікам дзень пры дні, ноч у ноч (З.П.). 10. Палата была зусім не такая, як сёння, -- кату на пяту; яшчэ ў гады майго дзяцінства ў ёй нярэдка тапіліся (У.А.). 11. Пятро не ўмеў гуляць у валейбол. Упершыню гэты недахоп здаўся яму страшэнна ганебным. Пятро згараў ад сораму (Шам.). 12. Калі ўжо да Калмана дабраліся, то пішы прапала (К-с).

**4. Выпішыце са сказаў фразеалагізмы і абазначце ў дужках, з якой часцінай мовы паводле значэння і сінтаксічнага ўжывання суадносіцца кожны фразеалагізм.**

1. Толькі я не краду, не махлюю, зарабляю капейку сваім мазалём і, калі трэба, ніколі не пашкадую (З.П.). 2. А сам Міхал аб гэту пору настройваў лыжы да сялібы ... (К-с). 3. Валя ж хадзіла як у ваду апушчаная (З.П.). 4. – Вось табе і на! – крыкнуў Віктар. – Навошта ж мы пакутавалі на балоце, калі тут ёсць такая добрая дарога! (Я.М.). 5. І загону таго як ступіць, і зямля ўжо была сухая, лёгкая, а зрабіць так Марыля нічога і не зрабіла (З.П.). 6. Падобна, што на мароз бярэцца. Дый не дзіва: сёння ранкам лёталі ўжо белыя мухі! ... (А.С.). 7. – Гэтыя прайдзісветы – аднаго поля ягады (Бр.). 8. – Андрэй здорава падупаў, адна скура ды косці, -- адзначыў сабе Лукаш. --Цяжка яму на гэтай нішчымніцы (М.Л.). 9. Вось і цяпер, у дзянёк гэты, як мае быць ужо адзеты, сказаць, адзеты і фарсіста і гладка выбрыўшыся, чыста, Міхал ужо разгладжваў вусы (К-с). 10. – Стой, крычу, гад печаны! Цяпер народ цябе судзіць будзе (Грах.). 11. Толькі я ўжо не мог, як раней, проста і блізка падысці да Надзеі. Саромеўся. І быў шчаслівы, калі хоць здалёк яна кідала на мяне позірк (З.П.). 12. Але ўсё ж сама па сабе жыве ва мне і ціхая радасць, і я ведаю – гэта Люся (В.Б.).

**5. Аб’яднайце фразеалагізмы ў сінанімічныя рады з наступнымі значэннямі: а)”нечакана прапасці, бясследна знікнуць”; б)“прыслугоўваць, дагаджаць, лісліваць”; в)”нявартьі, нікчэмны чалавек”; г)”ад пачатку да канца”.**

У тры пагібелі згінацца, абсалютны нуль, ад а да я, як у ваду кануў, як вадой змыла, хадзіць на задніх лапах, абсевак у полі, ад альфы да амегі, як скрозь зямлю праваліўся, і след прастыў, адстаўной казы барабаншчык, лістам слаць, на руках насіць, ад дошкі да дошкі, жаба ў каляіне, як ветрам здзьмула, падпусціць лёстачак, танцаваць пад дудку, варона загуменная, макам рассыпацца, як маланкай спаліла, гад печаны.

**6. Падбярыце да прыведзеных рускіх фразеалагізмаў беларускія адпаведнікі. Пры неабходнасці карыстайцеся “Русско-белорусским фразеологическим словарем” (Мн., 1991) І. Кісялёва.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

С какой стати, пятая спица в колеснице, два сапога пара, рассыпаться бисером, вожжа под хвост попала, валять дурака, очертя голову, ни бельмеса, не тут-то было, нести ахинею, почем зря, расшибаться в лепешку, у черта на куличках, не мое дело, на худой конец, к шапочному разбору, куда ни поверни, идти по миру, наставить нос, вскружить голову, не по себе, ни к селу ни к городу, каждая курица свой насест хвалит.

**7. З “Беларуска-рускага слоўніка” (Мн., 1988-1989) выпішыце фразеалагізмы са словамі *вецер, глядзець, галава* і іх рускія адпаведнікі.**

**8. З “Русско-белорусского словаря” ў 3 т. (Мн., 1993) выпішыце пяць фразеалагізмаў, кампаненты якіх у рускай і беларускай мовах не супадаюць**.

**9. Прачытайце сказы, знайдзіце мнагазначныя фразеалагізмы і растлумачце іх значэнні.**

1. Ну і далі хлопцы дыхту, столькі зямлі перавярнулі. І за адзін дзень (Каратк.). 2. Сарганізаваў [Даніла], чуваць, такіх малайцоў, як сам, ды дае панам дыхту (Кр.). 3. Прыход Зарубы, фельчара, памог падняцца на ногі Януку (М.Т.). 4. ... Сяк-так паднялася на ногі, крыху абжылася, -- каторы ўжо год, як вярнуліся ў пустыя вуглы, на голае поле (Б.). 5. Стаміўшыся ад доўгага паходу па незнаёмым лесе, хлопцы заснулі і храпуць на ўсе застаўкі (К-с). 6. Усе маўчалі, чакалі прызнання Яна, толькі сам ён, замест адказу, усміхаўся на ўсе застаўкі (Мур.). 7. Ніхто не пакінуў сваіх кароў, не крануў пальцам, каб пасобіць гаротнай кабеціне знайсці сына (Р.М.). 8. – Ідзіце. Ніхто вас і пальцам не кране (Грах.).

**10. Вызначце стылістычныя разрады фразеалагізмаў: стылістычна нейтральныя (міжстылёвыя) , гутарковыя, кніжныя. Растлумачце іх значэнне. Стылістычную прыналежнасць фразеалагізмаў пры неабходнасці праверце па “Фразеалагічным слоўніку беларускай мовы” (Мн., 1993) І. Лепешава.**

Альфа і амега, з-пад носа, адзін чорт, ад усяго сэрца, у агонь і ваду, на адной назе, адліваць кулі, акінуць вокам, сесці на шыю, браць слова, месца пад сонцам, без задніх ног, прыйшло на думку, перакінуцца словам, пакласці руку на сэрца, стрымаць слова, брацца за розум, лясы тачыць, віламі па вадзе пісана, паміж молатам і кавадлам.

**11. З “Этымалагічнага слоўніка фразеалагізмаў” (Мн., 1993) І. Лепешава выпішыце тры артыкулы, у якіх тлумачацца ўласнабеларускія фразеалагізмы.**

**12. Згрупуйце тэматычна і запішыце наступныя прыказкі. У якіх жыццёвых сітуацыях вы б іх выкарысталі?**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці; на ўсё ёсць мера; што занадта, тое і свіння не есць; перш папрацуй, а тады патанцуй; добра гаварыць, ды нядобра тварыць; мякка сцеле, ды мулка спаць; трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца; была нядзеля – і мы дудзелі, цяпер серада – працуй, грамада; вады не засіліш не паварушыўшыся, рыбы не зловіш не памачыўшыся; што задужа – не здарова; на вуснах -- мёд, а на сэрцы – лёд; у вочы катком, а за вочы варком; гульня, ды не штодня; годзе цалавацца, пара і на хлеб старацца; шырокая лыжка рот дзярэ; усё добра, што ў меру, а што зашмат, тое не ў лад; па дарозе ідучы, грыбоў не збярэш.

**13. Растлумачце сэнс крылатых выразаў і афарызмаў.**

1. Эгаізм – чалавечых душ іржа (Гіл.). 2. З людзьмі трэба абыходзіцца па-добраму, калі хочаш, каб і да цябе адносіліся па-людску (В.Б.). 3. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць (К.Ч.). 4. Каханне і веру не трэба ўсім выстаўляць напаказ – душу чуе толькі неба (А.Л.). 5. Без гнязда не пражыве не толькі птушка, а і чалавек (В.Б.). 6. Пакуты робяць чалавека чалавекам. Чалавек без пакут – трава (В.Б.). 7. Друг сапраўдны назаляць у бядзе не стане (В.З.). 8. Любімых не забываюць у радасці, а ў горы любяць яшчэ мацней (Грах.). 9. Ешце з голаду, кахайце змоладу – іначай вы – ні к сялу ні к гораду (Вярц.). 10. Патрыёт любіць сваё, а нацыяналіст болей ненавідзіць чужое (В.Б.). 11. Ад шчасця слёзы ў дзяцей не льюцца, ад шчасця хочацца ім пець (Гіл.). 12. Калі ты нават нешчаслівы, надзею ў сэрцы не губі (Астр.).

**14. Карыстаючыся зборнікам "Крылатыя словы і афарызмы" (Мн., 1960) Ф. Янкоўскага, устанавіце аўтараў наступных крылатых выразаў і афарызмаў.**

1. Забілі зайца, не забілі, але ж, брат, гуку нарабілі. 2. Рупная пчала ўмее мёд сабраць і з горкіх кветак. 3. Дум не скуеш ланцугамі. 4. Да славы прагныя, ды вузкія ў плячах. 5. Гуслям, княжа, не пішуць законаў. 6. Кожны чалавек – гэта цэлы свет. 7. Спынішся – плынню адгоніць назад. 8. Без чалавечнасці не будзе вечнасці. 9. Кожны другога раззброіць рад, а сам – нібы кветка мімозы; на вуснах у кожнага – шакалад, а за пазухай – бамбавозы. 10. Хваробы лечаць і атрутамі. 11 Адны жабракі могуць праз усё жыццё толькі браць.

**15. Знайдзіце ў сказах перыфразы, растлумачце іх, падбярыце адпаведныя ім словы-назвы.**

1. Побач, ля канавы, растросшы на ветры тонкае голле, жалобна шумелі зрудзелыя лісцем бярозы. Яны былі тоўстыя і, відаць, дужа старыя, гэтыя спрадвечныя вартавыя шляхоў (В.Б.). 2. Прывет табе, зямля Тараса, зямля пявучая братоў, куды плывуць напевы нашы на крылах сонечных вятроў (М.Т.). 3. Палаеш трывожнай зарою маленства майго партызанскага, з пагнутай бляшанкі жароўня – намесніца сонца ў замаразкі (Р.Б.). 4. Ні дождж, ні град цябе не пасціць, надзейны хлеб маёй зямлі (Р.Б.). 5. Яна адкрыла лісты папараці ў кошыку і паказала генералу свежыя маладыя баравічкі: "Ну, то давай сваю торбу, насыплю грыбоў". Генерал адчыніў сваю скураную спадарожніцу, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мар'яна зычліва высыпала ў яе ўсе свае грыбы (Пестр.). 6. Шчэ гнёзды стылыя, пустыя соты, а ўжо ад слоў хмялее давідна і ні пра што не думае вясна – дачка гарачай ласкі і пяшчоты (Р.Б.). 7. ... Бульбу завезлі ў Еўропу з Амерыкі толькі ў XVI стагоддзі, а ў Беларусі наш цяперашні другі хлеб з'явіўся яшчэ гадоў праз дзвесце (У.А.). 8. Васількі тваіх воч узыходзяць пяшчотай, Беларусь – бераг белых буслоў (Р.Б.). 9. Хутка на аэрадроме распаляць сігнальныя кастры. Да іх [партызан] прыляцяць жалезныя птушкі з Вялікай зямлі (Пестр.). 10. Сёння ў бой выпраўляў тваго сына, ляснога салдата (Луж.). 11 Будуць землякі ўздымаць штогод золата мясцовае са дна беларускіх багнішч і балот (М.А.). 12 Дзенісевіч прачытаў перадавую і зараз жа паправіў свае шкляныя колы ўверх (Пестр.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ